# РЭЦЭНЗІІ

**Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны): Вучэб. дапам. для 11 кл. / А.А.Каваленя, У.І.Лемяшонак, Б.Дз.Далгатовіч і інш.; Пад рэд А.А.Кавалені, М.С.Сташкевіча. – Мн.: Выдавец. цэнтр БДУ, 2004. – 280 с.: іл., карт.**

**Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны): Вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйш. адукацыі / А.А.Каваленя, У.І.Лемяшонак, Б.Дз.Далгатовіч і інш.; Пад рэд А.А.Кавалені, М.С.Сташкевіча. – Мн.: Выдавец. цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.: іл., карт.**

Цікавасць да другой сусветнай вайны з цягам часу не змяншаецца. Напярэдадні 60-й гадавіны Перамогі над нямецкім нацызмам звернемся да прац беларускіх навукоўцаў, прысвечаных перыяду 1939–1945 гг. Значнай падзеяй мінулага года стала выданне вучэбных дапаможнікаў да спецкурса **«Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны)»**. Над гэтымі выданнямі працавалі вядучыя ваенныя гісторыкі, а менавіта А.А.Каваленя, У.І.Лемяшонак, М.Г.Жылінскі, К.І.Казак, С.Я.Новікаў, Б.Дз.Далгатовіч. Перш за ўсё трэба адзначыць, што кнігі і для школьнікаў, і для студэнтаў напісаны на добрым навуковым ўзроўні, і ў той жа час матэрыял у іх выкладаецца так, каб зацікавіць навучэнцаў. Аўтары ўлічвалі найноўшыя дасягненні як айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі. У кожнай з названых кніг тры раздзелы: 1. Савецкі Саюз і краіны свету напярэдадні і ў пачатку другой сусветнай вайны. 2. Барацьба савецкага народа супраць германскай агрэсіі. 3. Разгром фашысцкага блока. Завяршэнне Вялікай Айчыннай і другой сусветнай войнаў. Кожны раздзел пачынаецца з кароткай характарыстыкі разглядаемага перыяду, пасля чаго матэрыял выкладаецца па тэмах. Ён уключае разнастайныя дакументы, айчынныя і замежныя, фотаздымкі і карты. Асвятленне гісторыі Беларусі перыяду 1939–1945 гг. падаецца ў кантэксце развіцця падзей у свеце, з улікам становішча на савецка-германскім фронце, а таксама баявых дзеянняў на Захадзе і ў краінах Усходняй Еўропы.

Ва ўводзінах даецца кароткі агляд айчыннай і замежнай гістарыяграфіі Вялікай Айчыннай вайны. Сучаснае маладое пакаленне амаль незнаёма з даследаваннямі па гісторыі гэтага перыяду. І таму нават сціслыя звесткі аб праведзеных даследаваннях і пералік найбольш грунтоўных навуковых прац дапамогуць моладзі зразумець, што гісторыкамі назапашаны значны матэрыял, які дазваляе зрабіць аб'ектыўныя высновы аб нашым недалёкім гераічным мінулым.

У дапаможніках значнае месца адведзена разгляду і асэнсаванню супярэчлівых адносін паміж дзяржавамі Еўропы на працягу 1930-х гадоў і ў пачатку другой сусветнай вайны. Гэтаму перыяду прысвечана прыкладна трэцяя частка і ў першым, і ў другім дапаможніках. Разгляд гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пачынаецца з аналізу міжнароднай дзейнасці Германіі ў 1930-я гг., што дапамагае паказаць паступовае спаўзанне свету да ўзброенага канфлікту. Гэта дазваляе студэнтам і школьнікам грунтоўна зразумець развіццё сітуацыі канца 1930 – пачатку 1940-х гг. Увага навучэнцаў засяроджваецца на такіх падзеях, як Мюнхенскае пагадненне, Пакт Рыбентропа–Молатава, захоп Польшчы, становішча ў Прыбалтыцы, савецка-фінская вайна, гітлераўская агрэсія ў Еўропе. Важна адзначыць, што аўтары паказваюць, як гэтая сітуацыя паўплывала на фарміраванне тэрытарыяльна-дзяржаўнай цэласнасці нашай краіны, на праводзімыя ў ёй сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні.

Як станоўчае адзначым, што дастаткова падрабязна расказана пра падзеі на савецка-германскім фронце і жыццё СССР на працягу ўсяго перыяду вайны, удзеле ўраджэнцаў Беларусі ва ўсіх буйных аперацыях, аб працы ў савецкім тыле, дзейнасці дзеячаў беларускай культуры і навукі ў час барацьбы супраць агрэсараў. У дапаможніках і падручніках па гісторыі, выдадзеных у Расіі, вайне супраць гітлераўскіх захопнікаў па невядомай прычыне, на жаль, прысвечаны кароткія раздзелы.

Значнае месца адведзена разгляду планаў акупантаў адносна ваенна-эканамічнага і палітычнага становішча на захопленых землях, плану «Ост», выказванням кіраўнікоў Германіі аб лёсе насельніцтва гэтых тэрыторый.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

На добрым навуковым узроўні падаюцца звесткі пра барацьбу насельніцтва Беларусі супраць агрэсараў. Увага навучэнцаў пастаянна засяроджваецца на тым факце, што моладзь краіны складала большую частку барацьбітоў.

Цікава, змястоўна і абгрунтавана выкладзены матэрыял пра вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў. Паказаны баявыя аперацыі на яе тэрыторыі, узаемадзеянні вайскоўцаў з насельніцтвам і партызанамі, першыя аднаўленчыя мерапрыемствы.

У якасці дадаткаў у разглядаемых дапаможніках даюцца храналогія па- дзей, слоўнік гістарычных тэрмінаў і паняццяў, кароткі біяграфічны даведнік, спісы крыніц і літаратуры, дзе асвятляюцца падзеі 1939–1945 гг.

Разам з тым адзначым, што некаторыя важныя падзеі на савецка-германскім фронце падаюцца не ў сістэме, адрывіста. Так, сярод абарончых баёў чамусьці зусім не звадваецца абарона Кіева. Незразумела, якім чынам у блакадзе аказаўся Ленінград. Мэтазгодна было б спыніцца на плане Гітлера ўвогуле спачатку захапіць Ленінград, а толькі пасля гэтага браць Маскву. Пра час зняцця блакады ў кнігах не паведамляецца

Засяроджваючы ўвагу на вызваленні Беларусі ў 1943–1944 гг., аўтары нічога не гавораць пра папярэднія аперацыі на савецка-германскім фронце. Не зразумела таксама і тое, што пэўнае месца адведзена расказу аб падрыхтоўцы гітлераўцамі аперацыі «Цытадэль» і ў той жа час зусім не знайшлося месца апісанню падрыхтоўкі савецкім камандаваннем аперацыі пад Сталінградам.

На наш погляд, у дапаможніках для сучаснага маладога пакалення мела б сэнс больш грунтоўна спыніцца на палітыцы генацыду фашыстаў у нашай краіне. Аўтары ж абмежаваліся, на жаль, толькі прывядзеннем прыкладаў з дакументаў.

Зразумела, што тэма калабарацыі з’яўляецца дастаткова складанай. У дапаможніках акцэнт зроблены менавіта на палітычнай калабарацыі. Аднак гэта з’ява больш шырокая. І моладзь, асабліва студэнцкая, адразу ўбачыла адзначаны недахоп. Здаецца, што сёння ўжо можна, не баючыся, пісаць пра ўсе группы людзей, якія так ці інакш супрацоўнічалі з акупацыйным рэжымам, звяртаючы ўвагу на тое, наколькі свядома ці пад уплывам абставін яны ішлі на такое супрацоўніцтва.

Значную цікавасць у сучаснай моладзі выклікае дзейнасць Арміі Краёвай і АУН – УПА на тэрыторыі Беларусі. У вучэбным дапаможніку для школ гэтая тэма ўвогуле не ўздымаецца, а ў дапаможніку для студэнтаў, распавядаючы пра дзейнасць Арміі Краёвай, чамусьці не разглядаюцца прычыны разрыву дыпламатычных адносін паміж урадамі СССР і Польшчы.

Выказаныя вышэй заўвагі ні ў якім разе не зніжаюць каштоўнасці выда- дзеных у нашай краіне вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта першая спроба на прасторы краін былога СССР стварыць спецыяльныя дапаможнікі па такой праблеме. Галоўная мэта – паказаць вайну як трагічную з’яву ў жыцці чалавецтва, што заўсёды прыносіць велізарныя людскія ахвяры і матэрыяльныя страты, і асэнсаваць месца беларускага народа, нашай моладзі ў барацьбе супраць ворагаў – аўтарамі паспяхова дасягнута. Таму мы ўпэўнены, што названыя дапаможнікі не толькі пашыраць веды маладога пакалення аб тых жудасных часах, сведкамі якіх сталі іх бабулі і дзядулі, але і будуць садзейнічаць выхаванню патрыятызму ў маладога пакалення.

З расійскіх выданняў вылучаецца двухтомнік «Война и общество. 1941–1945». На ім і спынімся падрабязней.

**Война и общество. 1941–1945: В 2 кн. / Отв. ред. академик Г.Н.Севостьянов. – М.: Наука, 2004. – Кн. 1. – 480 с.; Кн. 2. – 410 с.**

Дадзеная праца па сутнасці з’яўляецца працягам выдадзеных у 1998–1999 гг. 4-томных ваенна-гістарычных нарысаў аб Вялікай Айчыннай вайне. У стварэнні выдання «Война и общество. 1941–1945» бралі ўдзел вядучыя спецыялісты Інстытута Расійскай гісторыі РАН. Аўтары адзначаюць, што вайна – гэта надзвычайна складаная палітычная з’ява. У яе асвятленні яны прытрымліваліся прынцыпаў гістарызму і комплекснага падыходу. У навуковы абарот уведзены велізарны масіў крыніц, якія дазваляюць па-новаму падысці да разгляду дзеянняў і лёсу розных груп насельніцтва ў час вайны, з максімальнай аб’ектыўнасцю паказаць розныя яе бакі.

Канцэпцыя выдання вызначыла яго структуру. У ім дзве кнігі. У першай разгледжаны ваенныя аперацыі, у другой – паказаны цяжар жыцця народа, які перамог нацызм. У кнігах асвятляюцца некалькі праблем. Кожная праблема прадстаўлена асобнымі артыкуламі. Аўтары выкарысталі багатую бібліяграфію, якая ўключае зборнікі дакументаў, падрыхтаваныя Інстытутам ваеннай гісторыі МА РФ, і вынікі навуковых даследаванняў, праведзеных у 1991–2002 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Расійскія даследчыкі яшчэ раз звярнулі ўвагу чытачоў на пытанні падрыхтаванасці Савецкага Саюза да вайны, становішча яго Узброеных Сіл, іх бая-        здольнасць, вызначылі прычыны паражэнняў савецкіх войскаў на пачатковым этапе вайны, сур'ёзныя стратэгічныя, палітычныя, ваенныя і дыпламатычныя пралікі, зробленыя, на жаль, кіраўніцтвам краіны. Так, у артыкуле «Кіраўніцтва ўзброенай барацьбой» Н.П.Дзямбіцкі выказвае думку, што ўсё ж такі вызначальнай прычынай сітуацыі, якая склалася ў 1941 г., было тое, што савецкія войскі перад пачаткам вайны не былі своечасова прыведзены ў баявую гатоўнасць і таму не занялі неабходных рубяжоў згодна з планам прыкрыцця Дзяржаўнай граніцы СССР.

У згадваемых 4-томных нарысах 1998–1999 гг. галоўная ўвага надавалася паказу ваенных дзеянняў, перш за ўсё апісанню буйнейшых кампаній і бітваў. Аднак, акрамя ўсім вядомых бітваў пад Масквой, Сталінградскай, Курскай, былі і іншыя. Перш за ўсё гэта тычыцца савецкіх ваенных кампаній 1942 г., які апошнім часам гісторыкі сталі называць вучэбным годам для савецкага палітычнага і ваеннага кіраўніцтва. Між іншым без дэталёвага разгляду прычын паражэнняў у Крыме, пада Ржэвам, спроб вызваліць Харькаў, аб якіх у гістарычнай літаратуры мала звестак, агульная панарама ходу вайны атрымліваецца няпоўнай. У разглядаемым двухтомным выданні акцэнт зроблены менавіта на самых складаных баявых дзеяннях цяжкага 1942 г., сітуацыі вакол Ленінграда, паказе адмоўнага ўплыву на ход падзей партыйных кіраўнікоў, калі яны некампетэнтна ўмешваліся ў ваенныя справы, і інш. Чытачам цікава будзе даведацца, што намеснік старшыні СНК СССР А.І.Мікаян у пачатку жніўня 1941 г. накіраваў у Ленінград вялікі паток рознага харчавання, а кіраўнік партарганізацыі горада А.А.Жданаў паскардзіўся на гэта Сталіну і запатрабаваў спыніць падвоз прадуктаў. Трагічныя наступствы такой непрадбачлівасці ўсім вядомы.

Асобны артыкул прысвечаны даследаванню механізма прыняцця рашэнняў, вывучэнню вопыту дзяржаўнага і стратэгічнага кіраўніцтва Дзяржаўнага камітэта абароны і Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

Трэба зазначыць, што такая праблема, як народ і вайна, на жаль, не атрымала ў кнігах дастатковага разгляду. Другая кніга рэцэнзуемага выдання прысвечана менавіта адносінам да вайны, ролі ў ёй розных груп насельніцтва: працоўных, сялянства, жыхароў Ленінграда, навукоўцаў, медыкаў, пісьменнікаў, дзеячаў царквы. Асабліва хочацца засяродзіць увагу на матэрыялах, прысвечаных разгляду псіхалогіі салдат, лёсу палонных, калабарацыяністаў, дэпартацыі народаў і рэпатрыяцыі савецкіх грамадзян пасля завяршэння вайны. Добра паказаны аўтарамі рух народнага супраціву на часова акупіраванай гітлераўцамі савецкай тэрыторыі, але адсутнічаюць характарыстыкі ўдзельнікаў партызанскага руху і падполля. Аналіз таго, хто і чаму выступіў на актыўную барацьбу супраць ворагаў, вельмі патрэбны пры разглядзе такой значнай праблемы, як народ і вайна. На жаль, гэта недахоп як айчыннай, так і расійскай гістарыяграфіі.

Змястоўнымі з'яўляюцца артыкулы аб кніжнай культуры, дзейнасці выдавецтваў у час вайны, аб адносінах да супрацьстаяння СССР і Германіі дзеячаў замежнай культуры. Цікавасць уяўляюць спісы надрукаваных навуковых выданняў у час вайны. Мэтазгодна засяродзіць увагу і на матэрыялах аб адносінах І.В.Сталіна з прэзідэнтам ЗША Ф.Рузвельтам і прэм'ерам Вялікабрытаніі У.Чэрчылем.

Выніковымі з'яўляюцца артыкулы аб цане Перамогі над нямецкім нацызмам і «дэмаграфічным рэху» мінулай вайны.

Расійскія гісторыкі ў чарговы раз зрабілі велізарную працу. У двухтомніку «Война и общество. 1941–1945» шмат карыснага знойдуць усе тыя, хто цікавіцца праблемамі Вялікай Айчыннай вайны.

***А.Я.Паўлава,***
*кандыдат гістарычных навук*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ